# Прадмова навуковага рэдактара

Культурная памяць – гэта спецыфічная для кожнай культуры, шляхам настаўлення і паўтарэння з пакалення ў пакаленне, форма перадачы і актуалізацыі культурных сэнсаў, якія накіроўваюць учынкі і перажыванні ў спецыфічныя рамкі ўзаемадзеяння ўнутры пэўнага грамадства. Важную ролю ў мнеманічнай аксіялогіі культуры адыгрывае літаратура, якая з’яўляецца неад’емнай часткай культуры. Беларускія творцы зрабілі значны ўнёсак у развіццё сусветнай літаратуры (А. Міцкевіч, У. Сыракомля, Я. Купала, Я. Колас, В. Быкаў, У. Караткевіч і інш.). Іх імёны вядомы сусветнай супольнасці. Але практыка даследчай дзейнасці сведчыць, што пад покрывам забыцця яшчэ знаходзяцца постаці, якія пры грунтоўным знаёмстве з іх творчасцю могуць заняць пачэснае месца ў шэрагу майстроў сусветнай літаратуры. Гэта ў поўнай меры тычыцца нашага славутага суайчынніка Івана Казіміравіча (Кузьміча) Кандрацьева. Ён нарадзіўся 9 (21) ліпеня 1849 г. у вёсцы Каловічы Вілейскага павета ў беднай сялянскай сям’і. Вучыўся ў Смаленскай школе ваенных кантаністаў (1856–1858), затым у фельчарскай школе пры Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі. У сярэдзіне 1860-х гг. пераехаў у Вільню і нейкі час працаваў ў канцылярыі папячыцеля Віленскай навучальнай акругі. Захапляўся тэатрам, паэзіяй. Выконваў час ад часу асобныя ролі
ў Віленскім тэатры.

У Вільні пачалася яго літаратурная дзейнасць. У 1868 г. у «Виленском вестнике» быў апублікаваны першы верш «Вильна 22-го октября 1868 г.». З 1872 г. і да трагічнага скону ў 1904 г. жыццё і творчасць І.К. Кандрацьева звязаны з Масквой. Тут з-пад яго пяра выйшаў шэраг шырока вядомых да нашага часу мастацкіх твораў на гістарычную

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэму: «Божье знамение», «Великий разгром», «Бич Божий» («Гунны»), «Драма на Лубянке», «Лютая година», «Раскольничьи гнезда», «Салтычиха», «Тифон-сокольник», «Церковная крамольница» і інш.

І.К. Кандрацьеў з'яўляецца аўтарам аб'ёмнага гістарычнага нарыса «Седая старина Москвы», ім напісаны гістарычны даведнік «Московский Кремль». Гэтыя творы і сёння выдаюцца ў Расіі вялікім накладам.

Наш суайчыннік вядомы і як драматург, які стварыў шэраг цікавых і запатрабаваных у той час вадэвіляў, драм, п'ес і сцэнічных жартаў: ім створаны «Волостной писарь», «Разлучница», «Легко отделался», «Березовая гать», «Воевода Волчий Хвост», «На Плющихе», «Ради копеечки» і інш.

Уражвае даследчыкаў і паэтычная спадчына І.К. Кандрацьева. Яго паэтычныя творы склалі два зборнікі «Думы и были» і «Под шум дубрав». Створаны такія буйныя творы, як паэмы «Полтавская певунья» (1876) і «Альманзор». Ім напісаны добра вядомыя і любімыя народам такія песні, як «По диким степям Забайкалья», «Очаровательные глазки», «Чудо-гусли», «Сила песни», «Свирель», «То песни родины моей…», «Достался жребий мне святой…», «Черноброва краса Дуся…» і інш.

І.К. Кандрацьеў займаўся таксама перакладамі славутых еўрапейскіх аўтараў. Сярод найбольш удалых лічацца яго пераклады вершаў Дж. Байрана, І.-В. Гётэ, Г. Гейне, В. Гюго, Ф. Капэ, Л. Камаэнса, А. Міцкевіча, Ф. Петраркі, Л. Уланда.

Пісьменнікам створана шмат празаічных і паэтычных твораў для дзяцей: апавяданне «Степка-растрепка», быліны пра волата Чурылу, рускага асілка Кажэмяку, волата Іллю Мурамца, баярына Калаварота, Садко, купца наўгародскага. Ім апрацаваны народныя казкі «Снегурочка» і «Сивка-бурка, вещая каурка». Значны інтарэс для экалагічнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выхавання маюць кнігі для пачатковага чытання «Искра Божья» і «В дружбе с природой», спрыяе засваенню гісторыі розных народаў этнаграфічная дзіцячая гульня «Лото племен и народов» і інш.

Шкада, але ў Беларусі пра плённую творчую дзейнасць І.К. Кандрацьева амаль нічога невядома. Асобныя біяграфічнага жанру артыкулы з’яўляліся ў Расіі, Літве. Няма звестак аб ім у Беларускай энцыклапедыі, у гісторыка-дакументальнай хроніцы Вілейскага раёна «Памяць», біяграфічных слоўніках. Ні адзін кандрацьеўскі твор не быў апублікаваны беларускімі выдавецтвамі. Толькі ў апошнія гады беларускія даследчыкі прыступілі да аналізу асобных кандрацьеўскіх твораў. У навуковых часопісах у 2012–2013 гг. з’явілася некалькі крытычных артыкулаў аўтара гэтых радкоў (часопісы «Народная асвета», «Гісторыя і грамадазнаўства», «Адукацыя і выхаванне»), дакладаў у зборніках навуковых канферэнцый. У навукова-даследчую дзейнасць уключыліся выкладчыкі і студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Пры непасрэдным удзеле міністра культуры Б.У. Святлова выдадзена манаграфія «Божы дар Івана Кандрацьева». Пэўны ўнёсак у вывучэнне жыцця і творчасці І.К. Кандрацьева зрабілі вілейскія краязнаўцы (Т. Бурко, С. Ганчар, А. Капцюг, А. Рогач), якія сабралі ўспаміны аб славутым земляку, праводзяць актыўную працу па ўвекавечанні яго памяці на малой радзіме. Кандрацьеўскія чытанні – яшчэ адзін значны крок у адкрыцці беларусам мастацкай спадчыны іх слыннага суайчынніка.

*А.І. Смолік, доктар культуралогіі, прафесар*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ